РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ВЕРАСНЯ 2025 г. СУБОТА № 182 (30570)

Пятніцу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў на Гродзеншчыне. Кіраўнік дзяржавы наведаў Свята-Успенскі Жыровіцкі мужчынскі манастыр. Сёлета манастыр святкуе сваё 505-годдзе. Таксама адзначаецца 555 гадоў з дня з'яўлення цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці — адной з самых вядомых і шануемых святыняў Беларусі. Жыровічы для нашай краіны — месца знакавае, яно ўсю сваю шматвекавую гісторыю было рэлігійным і адукацыйным цэнтрам, захоўвала і аберагала крыніцы духоўнасці нашага народа. З лёгкай рукі Прэзідэнта Жыровіцкі манастыр вядомы як «жамчужына праваслаўя». Для многіх беларусаў (і не толькі) Жыровічы з'яўляюцца месцам сілы, таму падчас візіту Прэзідэнта гаварылі, вядома, аб духоўным, але не забыліся і пра надзённае.

СТАР. 2–3



# «РЭЛІГІЙНЫ МІР І СПАКОЙ — АДЗІН СА СКЛАДНІКАЎ УСЕАГУЛЬНАГА НАШАГА МІРУ»

## Надзённыя пытанні і духоўныя каштоўнасці — акцэнты паездкі кіраўніка дзяржавы ў святыя мясціны



МУРАЛ МАШЫНА-БУДАЎНІКАМ 8–9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

УРАДЖАЙ-2025

## СВЯТА САПРАЎДНЫХ ГЕРОЯЎ





**З завяршэннем жніва аграрыяў самых ураджайных рэгіёнаў краіны павіншаваў Прэзідэнт**

Сёння на Гродзеншчыне і Міншчыне праходзяць абласныя «Дажынкі».

СТАР. 4

# «РЭЛІГІЙНЫ МІР І СПАКОЙ — УСЕАГУЛЬНАГА



## НЕ ГРОШЫ ПРАСІЦЬ, А ТАЛАКОЙ РАБІЦЬ

З надзённага і пачалі. «Некаторыя элементы, якія акружаюць гэту мясціну, сведчаць, што тут сёе-тое рабілі на хуткую руку зусім нядаўна. І па-ваеннаму, так, каб далажыць, — выказаў заўвагі кіраўнік дзяржавы. — Не ўсё зроблена, абсалютна не ўсё. Запомніце: гэта жамчужына праваслаўя. Так вызначылі, значыць, трэба зрабіць так, каб ні аднаго ўчастка тут не было недагледжанага. Тут жылі святыя людзі. Мы для праваслаўных павінны тут зрабіць ідэальнае месца».

У лютым, сустракаючыся з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў ім стварыць свой рэлігійны цэнтр. «Трэба патрошку дапамагаць усім, каб захаваць мір і спакой на беларускай зямлі», — зрабіў акцэнт Аляксандр Лукашэнка. Жыровічы адразу былі вызначаныя як цэнтр праваслаўя. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што, дапамагаючы адной канфесіі, трэба не забываць і пра дапамогу іншым. Інакш могуць пачацца непаразуменні, што, вядома, нікому не трэба.

> **«Зыходзіць неабходна з таго, дзе і што нам трэба зрабіць, каб захаваць мір і спакой на гэтай зямлі. А рэлігійны мір і спакой — адзін са складнікаў усеагульнага нашага міру», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт перакананы: да дапамогі канфесіям трэба падыходзіць рацыянальна. Паводле яго слоў, у дзяржавы яшчэ мноства пытанняў, якія трэба вырашаць у першую чаргу, напрыклад жыллё, дарогі, жыллёва-камунальная гаспадарка, сельскагаспадарчая тэхніка і іншыя. А вось, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, ніхто не скардзіцца на тое, што няма куды схадзіць памаліцца. Беларускі лідар адзначыў, што цяпер менш людзей ходзіць у цэрквы, якіх у краіне нямала, таму да будаўніцтва новых храмаў трэба падыходзіць узважана. «Давайце будаваць, дзе трэба. Дзе людзям трэба прыйсці і душу адвесці, або сэрца, дзе трэба пакланіцца. Але жыллё? У храмах людзі жыць не будуць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт настойвае: выдаткоўваючы дзяржаўныя сродкі, трэба расстаўляць прыярытэты. Прыярытэтам ён назваў дах над галавой у людзей, перш за ўсё вайскоўцаў. «Як я іх буду пасылаць на вайну (не дай бог, вядома), калі іх дзецям і жонкам няма куды ісці? Таму ўсіх трэба забяспечыць жыллём. І ўсе ставяць пытанне: жыллё, жыллё, жыллё. Гэта прыярытэт прыярытэтаў, з гэтага трэба зыходзіць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Трэба разумець: храм давайце будзем будаваць, калі ёсць грошы». Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што праваслаўная канфесія — самая шматлікія ў краіне, а дапамога патрэбна і тым, у каго менш вернікаў. І гэты фактар таксама неабходна ўлічваць.

> **«Трэба падключаць усіх. І перш за ўсё я вельмі разлічваю на царкву, што мы адродзім добрае — добрае з савецкіх часоў, — калі мы не грошы прасілі, а талакой усе збіраліся і сёе-тое рабілі. Я ўпэўнены, што тут шмат людзей, якія гатовы падключыцца», — сказаў Прэзідэнт.**

Ён заклікаў і святароў дзейнічаць больш актыўна, у адным рэчышчы з уладамі. «Мы з гэтага будзем зыходзіць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы не зробім, якімі б нашы дзеці святымі ні былі, якая б моладзь у нас добрая ні была, без нас ужо ніхто не зробіць».

## «ВЯСНОЙ БУДЗЕЦЕ ЗДАВАЦЬ ЭКЗАМЕН!»

Абмяркоўвалі і зямное. Прэзідэнт звярнуў увагу на ход сельскагаспадарчых работ. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў: вясной кіраўніцтва Гродзенскай вобласці будзе здаваць экзамен, як пасеяна, як усё прыведзена ў парадак. Беларускі лідар выказаў і бягучыя заўвагі. «Па кукурузе аналіз не правялі, дзе будзеце на зерне, дзе будзеце на сілас касіць. Я баюся, што ў нас выйдзе так, што мы разлічваем атрымаць зерне кукурузы, а кукуруза не саспее. І мы страцім час, каб яе ўбраць на сілас. Не ўбяром на сілас — кукуруза перасохне, і зерне не атрымаем ад кукурузы», — выказаў занепакоенасць кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





# АДЗІН СА СКЛАДНІКАЎ НАШАГА МІРУ»

расказаў, што напярэдадні абмяркоўваў гэту тэму з кіраўніком Мінсельгасхарча: «Я яго дапытваў учора: ты мне растлумач, дзе, што і як, ці саспее кукуруза?.. Пачынаюцца агульныя фразы філасофскія».

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ўважліва паглядзець на гэта пытанне. Ён таксама звярнуў увагу, што на палях дагэтуль не сабраная салома — і за гэтым трэба сачыць.

**«Не збяром салому — немагчыма нічога рабіць на гэтым полі», — нагадаў правіла земляробства беларускі лідар.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, што пасеяна па азімых збожжавых. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый Караеў далажыў, што на дадзены момант засеяна 30 % плошчаў ад запланаванага. У кожным раёне вобласці засталося пасеяць прыкладна па 8 тысяч га, тэмпы за апошнія два дні ўзнялі ўдвая — па 500 га штодня ў кожным раёне засейваюцца.

«Да 1 кастрычніка ў цябе ўсё павінна быць пасеяна. Далей няма чаго залазіць у пасяўную. Трэба пасеяць. Але не збярэш салому — не пасееш», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён звярнуў увагу, што ў вобласці павольна ідзе ўборка буракоў, пацікавіўся і ўраджаем бульбы. «Менш, чым у іншыя гады, але свае патрэбы мы закрываем», — сказаў Юрый Караеў. Ён запэўніў, што ёсць і дадатковыя аб'ёмы для паставак, напрыклад у Мінск: «Мінску таксама мы даём. На 90 % дагаворы заключаныя ўжо, вызначана, хто захоўвае, хто будзе браць».

«Глядзі, каб у нас не было праблем з агароднінай і бульбай», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Юрый Караеў дадаў, што Гродзенская вобласць гатова падзяліцца ўраджаем яблыкаў. Прэзідэнт гэта ацаніў. «Калі ёсць лішнія яблыкі — аддай. Падыдзі з дзяржаўных пазіцый, а не толькі з пазіцый вобласці», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў і пра падрыхтоўку сховішчаў для агародніны, садавіны, бульбы.

**«Гэта па-ваеннаму трэба рабіць», — даручыў ён. І нагадаў: вясной усе будуць здаваць экзамен.**

## «ГЭТА ВАЖНА ДЛЯ МОЛАДЗІ»

Аднак, нягледзячы на важнасць сельскагаспадарчай тэматыкі, не яна была галоўным пытаннем гэтай прэзідэнцкай камандзіроўкі. Кіраўнік дзяржавы быў больш засяроджаны на духоўных пытаннях. У Свята-Успенскім саборы Аляксандр Лукашэнка запаліў свечку перад Жыровіцкай іконай Божай Маці. У 1470 годзе ікона з'явілася пастушкам прама на грушавым дрэве. З гэтай дзівоснай падзеі і пачалася гісторыя Жыровічаў як цэнтра праваслаўя. А паколькі гэта цэнтр праваслаўя, вядомы за межамі нашай краіны, Прэзідэнт настойвае: тут усё павінна быць у ідэальным парадку.

**«Усё трэба зрабіць, каб сюды людзі пайшлі. Гэта жамчужына, моладзь тут будзем выхоўваць», — сказаў ён.**

У размове з мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Веніямінам Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рэлігійныя цэнтры трэба стварыць перш за ўсё для будучых пакаленняў. Пры гэтым, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, гнаць у царкву нікога не трэба, а трэба стварыць умовы, каб моладзь сама прыходзіла ў храм. Паводле яго слоў, роля царквы ў тым, каб закладваць духоўныя, маральныя асновы. Але разам з тым трэба праяўляць і гнуткасць у асобных пытаннях, улічваць сучасныя рэаліі, каб быць бліжэй да людзей.

**«Мы ж яе, моладзь, не перарабім. У чымсьці перарабіць вы павінны, але ўжо радыкальна не перарабім, таму дзесьці трэба крыху і прыстасавацца, каб людзі былі нашы, каб яны былі ў царкве», — арыентаваў кіраўнік дзяржавы.**

«Трэба не перарабляць, але карэктаваць», — пагадзіўся мітрапаліт Веніямін. Прэзідэнт заўважыў, што ў Беларусі гэта пакуль удаецца. Мітрапаліт расказаў, што сёння ў нашай і ў іншых краінах сярод моладзі набірае папулярнасць такі кірунак, як манастырынг. Ён патлумачыў: гэта калі людзі прыязджаюць у манастыр, каб адарвацца ад інтэрнэту, тэлефона, пажыць, папрацаваць.

Прэзідэнту далажылі аб ходзе рэстаўрацыі манастырскага комплексу. Гэта пытанне з самага пачатку знаходзіцца ў полі зроку кіраўніка дзяржавы. У 1996 годзе Аляксандр Лукашэнка наведваў манастыр у дзень свята Жыровіцкай іконы Божай Маці. Ужо тады было зразумела, што рэстаўрацыя патрэбная сур'ёзная. З пачатку 2000-х гадоў манастырскі ансамбль пачаў паэтапна абнаўляцца: рэстаўравалі вучэбныя карпусы семінарыі, затым прыступілі да аднаўлення брацкага корпуса і іншых збудаванняў. Наведваючы манастырскі комплекс у 2021 годзе, Прэзідэнт даручыў на працягу чатырох гадоў завяршыць добраўпарадкаванне не толькі манастыра і яго тэрыторыі, але і самога аграгарадка. За гэты час былі рэстаўраваны Свята-Успенскі сабор і Богаяўленская царква. Працягваецца рэканструкцыя Георгіеўскага храма — ён знаходзіцца ў аддаленні ад абіцелі, але таксама ўваходзіць у ансамбль манастыра. Добраўпарадкаваны цэнтр аграгарадка Жыровічы, ён гарманіруе з манастырскім комплексам. «Усё трэба прывесці ў парадак, каб паломнікі, прыходзячы сюды, бачылі, што мы дакрануліся да гэтага, што мы не проста гаворым, але і робім», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнту расказалі, што да ўсіх работ актыўна прыцягваецца моладзь — студэнты, семінарысты. Кіраўнік дзяржавы пахваліў такі падыход.

На тэрыторыі Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра пахаваны першы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Філарэт. Аляксандр Лукашэнка наведаў яго магілу. І ў знак павагі ўсклаў букет белых руж — любімых кветак мітрапаліта.

**«Цэнтр добры, прыгожы. Месца добрае, але трэба дашліфаваць, асабліва ўскраіны», — сказаў напрыканцы Прэзідэнт.**

На памяць пра наведванне Свята-Успенскага манастыра кіраўніку дзяржавы падарылі карціну «Свята ў Жыровічах». Аўтар карціны — беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Уладзімір Барабанцаў. На карціне намалявана свята Вербнай нядзелі на фоне Свята-Успенскага сабора Жыровіцкага манастыра. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што карціна зойме пачэснае месца ў Палацы Незалежнасці.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*аг. Жыровічы.*
**Фота БелТА.**







# СВЯТА САПРАЎДНЫХ ГЕРОЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





**У віншавальным звароце да аграрыяў Мінскай вобласці** гаворыцца: «Каравай Міншчыны сёлета важыць больш за 2 мільёны тон. Гэта чвэрць рэспубліканскага намалоту і самы вялікі ўнёсак з усіх рэгіёнаў краіны. Рэкордная ўраджайнасць і добрыя паказчыкі практычна ў кожным раёне вобласці з'яўляюцца сведчаннем гаспадарлівага падыходу да зямлі і захавання тэхналогій».

Асобныя словы ўдзячнасці Прэзідэнт адрасаваў камбайнерам і вадзіцелям, якія прадэманстравалі выдатныя рэзультаты на айчыннай тэхніцы.

**У звароце да хлебаробаў Гродзенскай вобласці** адзначаецца, што працаўнікі Прынёманскага краю, аб'яднаныя адказнасцю і мэтанакіраванасцю, зноў даказалі, што для прафесіяналаў, якія шчыра любяць сваю справу, любы выклік пераўтвараецца ў новую магчымасць.

«У вельмі няпростых па ўмовах надвор'я год вы вырасцілі і сабралі больш за 1 мільён 700 тысяч тон збожжавых і зернебабовых культур з рапсам. Гэта другі вынік па краіне. Атрымана самая высокая ўраджайнасць збожжа — больш за 50 цэнтнераў з гектара, а па асобных гаспадарках — больш за 90. Гэта стала магчымым за кошт высокай культуры земляробства, заснаванай на спрадвечных традыцыях, гаспадарлівага стаўлення да роднай зямлі, перспектыўных навуковых распрацовак», — сказана ў віншаванні.

Гарады, што прымаюць абласныя фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі — Заслаўе (Мінская вобласць) і Ваўкавыск (Гродзенская вобласць), — істотна падрыхтаваліся да ўрачыстасцяў. Добраўпарадкаваны і ўпрыгожаны вуліцы, святочныя праграмы насычаны цікавымі мерапрыемствамі, а самае галоўнае — створана атмасфера свята і ўдзячнасці хлебаробам. Тым, без каго немагчыма ўявіць развіццё і росквіт нашай Радзімы.

***(Падрабязнасці святкавання абласных «Дажынак» чытайце ў наступным нумары.)***




ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

# «НАБОР ДЛЯ БАРШЧУ» ЗБІРАЮЦЬ

## Беларускія аграрыі пачынаюць пастаўкі агародніны і яблыкаў на зіму ў рамках дзяржзаказу

«Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 22 ліпеня № 399, сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны пачынаюць выкананне дзяржаўнага заказу на пастаўку агародніны на зіму. Асаблівая ўвага ўдзелена так званаму «набору для баршчу» — асноўным відам агародніны, якія традыцыйна складаюць аснову нашай кухні», — расказалі ў прэс-службе Мінсельгасхарча.

На міжсезонны перыяд 2025/2026 гадоў неабходна паставіць усяго амаль 150 тысяч тон агародніны і яблыкаў.

«Каб забяспечыць насельніцтва якаснымі прадуктамі ў перыяд міжсезоння, фермеры і гаспадаркі абавязаны закласці прадукцыю на захоўванне да 15 лістапада. Дзяржава падтрымлівае працэс: рэгулюе цэны, кантралюе якасць і нават прадугледжвае частковую перадаплату (аванс — 10 %) для сельгасвытворцаў. Гэта дапамагае аграрыям планаваць расходы і гарантавана рэалізоўваць ураджай», — падкрэслілі ў Мінсельгасхарчы.

### У РАМКАХ ДЗЯРЖЗАКАЗУ НА МІЖСЕЗОННЫ ПЕРЫЯД 2025/2026 ГОДА НЕАБХОДНА ПАСТАВІЦЬ УСЯГО 148,78 ТЫСЯЧЫ ТОН ГАРОДНІНЫ.



- **58,85** тыс. тон бульбы
- **23,92** тыс. тон капусты белакачаннай
- **8,42** тыс. тон буракоў сталовых
- **14,77** тыс. тон морквы
- **16,03** тыс. тон цыбулі рэпчатай
- **26,81** тыс. тон яблыкаў свежых

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автомобильный парк № 19»**
*(Продавец, местонахождение: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Петра Гучка, д. 7)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**АВТОБУСА MAZ-256100, 2007 г. в.,**
**регистрационный знак АВ 3383-5, рама № Y3M25610070000702, инв. № 808756, цвет бордовый.**

Транспортное средство расположено по адресу: **Минская область, г. Марьина Горка, ул. Петра Гучка, д. 7.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **18 720,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 872,00** бел. руб.

*Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.*

Условия аукциона:
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенном по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **22.10.2025 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8029) 678-77-37.**

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП). Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

УНН 6010703699

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 2»**
*(продавец, местонахождение: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 3)*
проводит открытый аукцион по продаже

**АВТОБУСА (вагон) MAZ 103062,**
**регистрационный знак АЕ1385-5, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M10306280003324, инв № 22004, цвет оранжево-белый, находящегося по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 3.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **12 900,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 290,00** бел. руб.

*Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.*

Условия аукциона:
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенном по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **22.10.2025 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8029) 766-61-13.**

УНН 601070249

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

# ЧАРГОВЫ КРОК У ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЭКАНАМІЧНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

## Адзін з найбуйнейшых транспартна-лагістычных цэнтраў краіны папоўніўся новым аб'ектам



Шматфункцыянальны мультымадальны комплекс пабудаваны ў рамках мадэрнізацыі і пашырэння ТЛЦ «Мінск-Белмытсэрвіс-2». Сучасны тэрмінал з неабходнай інфраструктурай для апрацоўкі грузаў, якія прыбываюць аўтамабільным і чыгуначным транспартам, адпавядае самым высокім стандартам арганізацыі складской гаспадаркі. Чакаецца, што новыя магутнасці найважнейшага лагістычнага звяна краіны ўзмоцняць эканамічны эфект. Адкрыццё комплексу стала свайго роду падарункам да прафесійнага свята — Дня мытніка.

Найноўшая пагрузачна-разгрузачная тэхніка, а таксама максімальная аўтаматызацыя гаспадарчых працэсаў дазваляюць аператыўна аказваць поўны пакет паслуг па захоўванні і апрацоўцы тавараў. Штомесяц у сярэднім тут апрацоўваецца 37 тысяч тон тавараў або каля 2 тысяч транспартных сродкаў. Галоўная перавага аб'екта — яго размяшчэнне паблізу сталіцы. Тут створаны ўсе ўмовы для вядзення бізнесу, працы людзей.

### ЗАКАНАДАЎЦЫ — НА ВАСТРЫІ ЖЫЦЦЯ

«Узвядзенне комплексу і новага тэрмінала — чарговы крок па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў справе забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў сферы эканомікі, займання ўпэўненай пазіцыі Беларусі як лагістычнага цэнтра ў сярэдзіне Еўропы, — звярнуў увагу падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця аб'екта **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА.** — Мы бачым, што адбываецца на заходніх граніцах, што робіць наша суседка Польшча, але на гэта адказваем адкрыццём новага комплексу. Сёння наша краіна ва ўмовах санкцый знаходзіць новыя рынкі збыту, транспартныя калідоры і паспяхова асвойвае ўсходні напрамак, краіны далёкай дугі».

Палата прадстаўнікоў удзяляе сур'ёзную ўвагу ўдасканаленню заканадаўчай базы, якая рэгулюе пытанні мытнай дзейнасці. «Летась былі прыняты змяненні ў Закон «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь», — канкрэтызаваў спікер. — Жыццё ўносіць карэктывы з улікам сённяшніх рэалій, таго, што адбываецца на знешнім контуры. На другой сесіі дэпутатамі былі ратыфікаваны 4 міжурадавыя пагадненні па пытаннях мытнай дзейнасці з такімі краінамі, як Індыя, Куба, Экватарыяльная Гвінея, Нікарагуа. Яны накіраваны найперш на спрашчэнне парадку мытнага афармлення шматлікіх грузаў паміж Беларуссю і гэтымі краінамі. Упэўнены, што кірунак будзе развівацца і ўдасканальвацца. Беларусь паспяхова працуе ў многіх структурах. Мы з'яўляемся паўнавартасным членам ШАС, што дае дадатковыя магчымасці для развіцця гандлёва-эканамічных адносін, а тут, вядома, без работы мытнай службы абысціся немагчыма».

Пасля адкрыцця аб'екта Ігар Сергяенка правёў сустрэчу з супрацоўнікамі Мінскай рэгіянальнай мытні. Спікер праінфармаваў калектыў аб заканадаўчай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, іншых задачах, якія стаяць перад дэпутацкім корпусам. Ішла размова і пра асноўныя сэнсы новага дзяржаўнага свята, якое днямі адзначалі беларусы, — Дня народнага адзінства.

### АРЫЕНЦІР — НА УСХОД

Як адзначыў **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ**, на тэрыторыі транспартна-лагістычнага цэнтра «Мінск-Белмытсэрвіс-2» пабудаваны дадатковыя складскія памяшканні на 5 тысяч квадратных метраў. «У тры разы пашырана кантэйнерная пляцоўка, павялічаны пляцоўкі для стаянкі транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць мытнае афармленне, палепшаны пад'езды да цэнтра, — дадаў ён. — Вельмі важна, што мы ўстанавілі тут маразільныя камеры, дэфіцыт якіх для захоўвання грузаў, што знаходзяцца пад мытным кантролем, адчуваўся ў краіне. Цяпер у Мінску, Мінскім рэгіёне ёсць магчымасць ажыццяўляць мытны кантроль любых відаў замарожаных або ахалоджаных тавараў».

Па словах Уладзіміра Арлоўскага, адкрыццё новага комплексу з'яўляецца адным са шляхоў, накіраваных на развіццё беларускай лагістыкі ў тым ліку ў бок Усходу. «Паток грузаў пераарыентаваўся: цяпер больш як 80 % мытных грузаў перамяшчаецца праз Расію, Казахстан, Кыргызстан і прыходзіць да нас з Усходу, — канкрэтызаваў ён. — Іх таксама трэба апрацоўваць. Гэта імпартныя грузы нашых суб'ектаў гаспадарання, гэта экспарт нашых суб'ектаў, які ідзе ў трэція краіны. Таму такія лагістычныя комплексы ўнутры краіны дазваляюць апрацоўваць грузы, якія ідуць з Усходу і на Усход. Мы і далей будзем развіваць магутнасці вакол краіны».

Наступны буйны транспартна-лагістычны комплекс, па словах старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта, будзе ўзведзены ў Віцебскай вобласці. «Калі нам закрываюць заходнія вароты, мы адчыняем усходнія, — дадаў ён. — Усё робім для таго, каб лагістычны паток не спыняўся, а, наадварот, нарошчваўся».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## У тэму

### Да польскіх перавозчыкаў — у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам

Журналісты пацікавіліся ў старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта сітуацыяй на польскай граніцы. «У звычайным парадку, калі граніца адкрыта, грузавікі, у тым ліку польскія, уязджаюць на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, тут адбываецца перачэпка паўпрычэпаў або перагрузка грузаў у транспартныя сродкі Еўразійскага саюза, і польскія грузавікі вяртаюцца ў Польшчу, — нагадаў Уладзімір Арлоўскі пра тое, як адбывалася транспарціроўка грузаў у гэтым напрамку да нядаўняга часу. — Цяпер, пасля таго як польскі бок закрыў граніцу, адпаведна, польскія грузавікі выехаць назад у Польшчу не могуць. Паколькі ўезд на тэрыторыю Беларусі часовы (звычайна ён складае 10 дзён), гэты тэрмін практычна ва ўсіх грузавікоў скончыўся, таму мы прынялі рашэнне аб яго прадаўжэнні яшчэ на 10 дзён. Гэты перыяд заканчваецца 27—28 верасня».

Што датычыцца далейшых дзеянняў беларускага боку ў выпадку, калі граніца з Польшчай не адкрыецца, кіраўнік мытнага ведамства праінфармаваў, што па заканчэнні адведзеных 10 дзён польскія грузавікі будуць размешчаны на нашых пляцоўках. «Да перавозчыкаў будуць прыняты меры ў адпаведнасці з заканадаўствам, — падкрэсліў Уладзімір Арлоўскі. — Мы спадзяёмся, што на працягу тыдня сітуацыя вырашыцца і польскі бізнес не пацерпіць ад дзеянняў польскіх улад».


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «СПЕЦМОНТАЖАВТОМАТИКА»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 07.10.2025.**

**Лот № 1 в составе:**

1. Административное помещение с инв. № 500/D-7022652, 2335,0 кв. м, г. Минск, ул. Могилевская, д. 41, пом. 1.
2. Кабельная линия 0,4 кВ, Республика Беларусь, г. Минск, 990, сеть электроснабжения.
3. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть, Республика Беларусь, г. Минск, 988, канализационная сеть.
4. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, Республика Беларусь, г. Минск, 989, водопроводная сеть.
5. Пожарная сигнализация.
6. Охранная сигнализация.
7. Прибор учета тепла с контроллером удаленным ИНДЕЛ – 1708.
8. Счетчик холодной воды JS-3.5.
9. Зеленые насаждения (полный список насаждений представлен на электронной торговой площадке «GOSTORG» (далее – ЭТП)).

Административное помещение находится в капитальном строении с инв. № 500/С-30165, которое расположено на земельном участке 500000000004002701, 0,3859 га. Общее долевое право постоянного пользования. Доля: 79/100.

Обременения: договоры аренды.

Начальная цена с НДС 20 % – 4 962 829,02 руб. Задаток – 496 282,90 руб.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом ЭТП. Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **03.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «АзотСпецТранс», 230013, г. Гродно, пр. Космонавтов, 100 |

**Предмет электронных торгов:**
транспортные средства и спецтехника (бывшие в употреблении), расположенные по адресу г. Гродно, пр. Космонавтов, 100

| Лот, № | Инв. номер | Наименование | Год выпуска | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 3000172 | Полуприцеп специальный самосвал OZGUL TRAILER G, р/зн. А 5782 В-4, | 2017 | **36 550,00** |
| 2 | 174864 | Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8857-4 | 2010 | **57 973,00** |
| 3 | 174865 | Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8856-4 | 2010 | **57 973,00** |
| 4 | 173870 | Грузовой фургон тентовый MAZ 5336 А5, р/зн. АЕ 8381-4 | 2008 | **13 192,00** |
| 5 | 11593 | Грузовой специальный автокран IN.PROIZV KRUPP KMK 6140, р/зн. AI 8536-4 | 1989 | **160 000,00** |
| 6 | 174760 | Грузовой специальный самосвал GAZ-SAZ-3507, р/зн. АВ 6480-4 | 2010 | **18 963,00** |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.10.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB3012004835008022600 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 4 % до 8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Подробная информация по размеру затрат и вознаграждения опубликована на www.ipmtorgi.by в карточке предмета электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 12.08.2025

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 29/25 по продаже имущества**

**ОАО «Гродненский стеклозавод»**

Аукцион проводится **21.10.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by (далее – ЭТП).
**Заявки на участие принимаются по 20.10.2025 включительно до 17.00**

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена продажи лота с НДС 20 %, рублей | Задаток, рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Штабелеукладчик ЛПУ-11.02 | 2004 | 0000041578 | 18060 | 1806 |
| 2 | Дробилка стеклобоя ДБ-400 | 2004 | 0000042139 | 450 | 45 |
| 3 | Гранулятор стекломассы ГР-2 | 2004 | 0000043056 | 7200 | 720 |
| 4 | Машина ЗПВМЗ | 1987 | 0000044132 | 11550 | 1155 |
| 5 | Автомат АПШ 12.00.000 | 2003 | 0000044136 | 25150 | 2515 |
| 6 | Загрузчик печи отжига 2ЗП-18 | 2004 | 0000044199 | 5600 | 560 |
| 7 | Упаковочная машина УПБ-1А | 2004 | 0000044203 | 4230 | 423 |
| 8 | Упаковочная машина УПБ-1А | 2004 | 0000044204 | 4230 | 423 |
| 9 | Прессовыдувная машина ЗПВМЗ П | 2004 | 0000044209 | 9260 | 926 |
| 10 | Стол поворотный ЛПУ-9.08 | 2004 | 0000044211 | 3660 | 366 |
| 11 | Стол поворотный ЛПУ-9.08 | 2004 | 0000044219 | 3660 | 366 |
| 12 | Питатель 1ПК-1552 | 2004 | 0000044220 | 12800 | 1280 |
| 13 | Питатель 1ПК-1552 | 2004 | 0000044221 | 12800 | 1280 |
| 14 | Питатель 1ПК-1552 | 2004 | 0000044222 | 12800 | 1280 |
| 15 | Транспортер «горячий» сетчатый ТГ-1/6,5с | 2004 | 0000044225 | 1600 | 160 |
| 16 | Печь отжига ПКГ-323 | 2004 | 0000044226 | 41830 | 4183 |
| 17 | Печь отжига ПКГ-323 | 2004 | 0000044227 | 41830 | 4183 |
| 18 | Печь отжига ПКГ-323 | 2004 | 0000044228 | 41830 | 4183 |

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. внести задаток на расчетный счет продавца BY68AKBB301 20000469614000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, получатель платежа – ОАО «Гродненский стеклозавод» филиал «Елизово», УНП 701485728, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 29/25 по лоту №_».
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона (размещено на странице лота).
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести лот) возмещает организатору аукциона затраты на его организацию и проведение и уплачивает вознаграждение в размере **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – не позднее 10 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона – не позднее 20 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора купли-продажи не договорятся об ином сроке.
Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона

**Организатор аукциона и оператор ЭТП: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22; realtorgi@expertiza.by, https://www.expertiza.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**КУП «Миноблавтосервис»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 22.10.2025.**

**Лот № 1:** Верстак слесарный металлический,
размер 168*68*85 см, 1986 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 288,00 руб.

**Лот № 2:** Верстак слесарный металлический,
размер 173*70*89 см, 1986 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 276,00 руб.

**Лот № 3:** Верстак слесарный металлический,
размер 167*67*85 см, 1986 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 360,00 руб.

**Лот № 4:** Верстак слесарный металлический,
размер 168*67*86 см, 1986 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 288,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–4:**
Минская обл., г. Солигорск, ул. Коммунальная, 4А.

**Лот № 5:** Фольксваген Джетта,
кузов (рама) № WVWZZZ1KZ7M163324, 2007 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 480,00 руб.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.

Извещение о проведении электронных торгов
размещено на сайтах Государственного комитета
по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by),
Минского областного исполнительного комитета
(minsk-region.gov.by, au.nca.by)
и на электронной торговой площадке «GOSTORG»
(gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**
УНП 190055182

# ЯК УЗОР НА ЎСЮ КРАІНУ

## Пацікавіліся, што робіцца ў Шклоўскім раёне, каб ён стаў прыкладам для іншых



Сёння тут усюды кіпіць работа: абнаўляюцца старыя вытворчасці, будуюцца новыя, узводзіцца жыллё, добраўпарадкоўваюцца тэрыторыі. Падчас свайго візіту ў Шклоўскі раён у красавіку гэтага года Прэзідэнт наведаў шэраг аграпрамысловых аб'ектаў і даў заданне кіраўніцтву раёна зрабіць іх узорна-паказальнымі. Шклоўшчына павінна стаць прывабнай пляцоўкай для жыцця і работы, куды з задавальненнем паедзе моладзь. Пра тое, што сёння для гэтага робіцца, — у нашай размове са старшынёй Шклоўскага райвыканкама Сяргеем БАРТАШАМ.



— Увага да нашага раёна сёння пільная, таму працуем на апярэджванне, — расказвае суразмоўца. — Адзін з галоўных аб'ектаў, работу над якім мы сёлета практычна скончылі, — гэта камбікормавы завод, які наведваў кіраўнік дзяржавы. Ставілася задача запоўніць магутнасці, якія не выкарыстоўваліся. Яны запоўнены, завод працуе ў штатным рэжыме. Цалкам аб'ект яшчэ не завершаны, плануецца зрабіць яго ў найбліжэйшы час. Працягваюцца работы па будаўніцтве кавярні, над інтэр'ерам якой працуюць найлепшыя дызайнеры, улічваюцца ўсе пажаданні жыхароў.



Важным аб'ектам для нас з'яўляецца новы, большай, чым у нас ёсць, магутнасці малочны камбінат, будаўніцтва якога цяпер вядзецца. Плануецца перапрацоўваць там каля 300 тон малака ў суткі. Гэтыя аб'ёмы мы ўжо маем, і новая перапрацоўка для нас вельмі важная і патрэбная. Плануецца стварыць на будучай вытворчасці 150 новых працоўных месцаў.

Вядзецца будаўніцтва райаграсэрвіса. Графікі таксама вытрымліваюцца. Прэзідэнт адзначаў яшчэ некалькі аб'ектаў, сярод якіх ПМК і майстэрні льнозавода. Мы знайшлі шляхі вырашэння пытання па перадачы часткі нявыкарыстанай маёмасці ПМК. У арганізацыі ёсць аб'ёмы, маштабы, пастаянна павялічваецца колькасць работнікаў. На льнозаводзе сёння поўным ходам ідзе рамонт.

Што датычыцца базы сельгасхіміі, то там таксама вядуцца работы. Умацоўваем фасады, зносім збудаванні, якія цалкам амартызаваны. Наводзім парадак на вызваленых ад іх тэрыторыях, і сёлета завершым работы. Будзе ўзводзіцца жыллё для работнікаў, якія працуюць у раёне. Сёння ў нас з беспрацоўем праблем няма, хутчэй наадварот. Завозім працоўную сілу з іншых населеных пунктаў, у тым ліку з-за меж раёна.

Распрацоўваем праекты на будаўніцтва малочнатаварных комплексаў для ААТ «Эксперыментальная база «Спартак» і ЗАТ «Вялікія Славені», якія дазволяць сысці ад састарэлых тэхналогій у вытворчасці. «Вялікія Славені» — моцная гаспадарка, якая мае найлепшыя паказчыкі як у жывёлагадоўлі, так і ў раслінаводстве. Яны першымі завяршылі ўборку збожжа, у гэтай гаспадарцы будзем праводзіць раённыя «Дажынкі». Яны адбудуцца ў кастрычніку, і аграгарадок Малыя Славені ўжо цалкам падрыхтаваны да свята. Але асабліва і рыхтавацца не прыйшлося. Парадку на тэрыторыях мы ўдзяляем шмат увагі, пастаянна разглядаем гэта пытанне на апаратных нарадах. Усё неабходнае робіцца ў планавым рэжыме.

***— Наколькі раён цікавы маладым спецыялістам, якія сюды прыязджаюць працаваць?***

— Яшчэ ні адзін шклаўчанін, які прыехаў у Мінск, прачнуўшыся там раніцай, не захапіўся: «Як жа тут хораша, як ціха!». А вось мінчане, якія да нас прыязджаюць, прызнаюцца, што ў нас добра. Сёння ўжо няма той мяжы паміж узроўнем жыцця на перыферыі і ў буйным горадзе. У нас таксама ёсць і Лядовы палац, і крамы на любы густ, і аб'екты для адпачынку. Прыемна, што 70 % маладых спецыялістаў, якія сёлета прыехалі ў раён, — мясцовыя жыхары. На нашай сустрэчы з імі былі і тыя, хто ўжо праходзіць адпрацоўку ў раёне. Двое з іх мінчане. Я выказаў здагадку, што калі скончыцца адпрацоўка, то яны, напэўна, вернуцца ў сталіцу. Але яны не пацвердзілі яе, сказалі, што яшчэ падумаюць. І мяне гэта шчыра радуе. Значыць, ёсць верагоднасць, што застануцца.

***— Сёлета АПК раёна прадэманстраваў бліскучыя вынікі. Намалочана больш чым 130 тысяч тон збожжа, ураджайнасць больш чым 50 ц/га.***

— Сапраўды, такога выніку даўно ў нас не было. Як і 19 тысяч тон рапсу. Гэта наогул новы рэкорд. Сакрэту асаблівага ў гэтым няма. Ураджай атрымліваецца з многіх складнікаў. На вынік уплывае ўсё: своечасовасць сяўбы, унясенне ўгнаенняў, абарона пасеваў, надвор'е таксама. Людзі працавалі, як заўсёды, самаадданa. А гэта праца вельмі цяжкая і карпатлівая. Але яна заўсёды дае станоўчы вынік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Шклоўскага райвыканкама і БелТА.**
*г. Шклоў*





# ЖЫЦЬ ПАЎНАЦЭННЫМ ЖЫЦЦЁМ

## Як у чашніцкім ТЦСАН сацыялізуюць людзей з інваліднасцю

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony/), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction/), Мядельского районного исполнительного комитета (**myadel.gov.by).**



# З ЗАХАВАННЕМ БАЛАНСУ



## **По выніках жніўня беларуская эканоміка выходзіць на пазітыўныя трэкі**

Вынікі работы эканомікі за восем месяцаў не зусім дасягнулі мэтавых параметраў, але і глыбокага расчаравання не прынеслі, што ўжо нямала, улічваючы агульны стан сусветнай прасторы. І калі не здарылася прарыву, то ўдалося ўтрымаць існуючыя пазіцыі і схіліць акцэнт да пазітыўных трэндаў. Цалкам праблемы не вырашаны, але прамысловая вытворчасць у жніўні вырасла ў параўнанні з ліпенем, палепшыліся паказчыкі і знешнегандлёвай дзейнасці.



Валавы ўнутраны прадукт за 8 месяцаў вырас на 1,6 %. З аднаго боку, вынік ніжэйшы за прагноз — 4,1 %. З іншага боку, такое адставанне мае свае аб'ектыўныя тлумачэнні. Па-першае, на галоўным інтэгральным эканамічным паказчыку адбіваецца часавы зрух агратэхнічных работ у параўнанні з мінулым годам. Сельская гаспадарка схільная да непрадказальнай сезоннасці, якую дыктуе асабліва капрызная ў апошнія гады кліматычная абстаноўка. У мінулым годзе ўборачная пачалася крыху раней за тэрмін, сёлета асноўныя работы праводзіліся амаль на месяц пазней, што адбіваецца і на макраэканамічных паказчыках. Гэта пацвярджаецца статыстыкай за жнівень. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў параўнанні са жніўнем мінулага года вырасла на 34,2 % і амаль у два разы павялічылася ў параўнанні з ліпенем гэтага года.

Па-другое, на экспарт, а адпаведна, і ВУП цісне астуджэнне расійскай эканомікі. На гэту тэму дастаткова шмат аналітычных матэрыялаў у інфармацыйнай прасторы, меркаванні аб ступені астуджэння эканомікі нашага суседа выказваюцца розныя. З нейкімі можна пагадзіцца, з іншымі — паспрачацца. Але факт застаецца фактам: кан'юнктура на нашу прадукцыю складаецца не самая ўдалая. Мала таго што змяншаецца сукупны плацежаздольны попыт, так за планамернае засваенне расійскага рынка яшчэ і ўзяліся вытворцы той жа тэхнікі з Паўднёва-Усходняй Азіі. Калі ў 2022—2023 гадах пастаўкі з гэтага рэгіёна насілі «разведвальны» характар — кампаніі прамацвалі дастаткова новы для іх рынак, то цяпер азіяцкія карпарацыі спрабуюць асталявацца надоўга і сур'ёзна. Прычым выкарыстоўваючы ўсю сваю моц фінансавых інструментаў стымулявання экспартнага попыту. Гэта не катастрофа: канкурыраваць можна, ёсць яшчэ незадзейнічаныя рэзервы ў нашых вытворцаў. Але канфігурацыя рынку аб'ектыўна крыху змянілася і патрабуе рэвізіі некалі паспяховых падыходаў і іх трансфармацыі.

Гэты працэс запушчаны і рухаецца планамерна. І, мяркуючы па лічбах, выйсце знаходзіцца. Калі па выніках васьмі месяцаў прамысловая вытворчасць, не будзем утойваць, прадэманстравала адмоўную дынаміку — усяго 0,8 %, але ўсё ж мінус, то ў жніўні ў параўнанні з ліпенем 2025 года выпуск прамысловай прадукцыі павялічыўся на 1,8 %. Поспех даволі сціплы, але ён сведчыць аб пэўным пераломе адмоўнага трэка і выхадзе ў станоўчую зону.

Аналагічная сітуацыя ў знешнегандлёвай дзейнасці. У студзені — ліпені імпарт (рост на 3,1 %) апярэджваў па дынаміцы экспарт (рост на 1,2 %). Сальда за гэты перыяд склалася адмоўнае — на ўзроўні 809 мільярдаў долараў. Але ў ліпені ў параўнанні з чэрвенем экспарт вырас на 6 %, а імпарт — усяго толькі на 1,3 %. І сальда па ліпені было дадатным і склала 93,8 мільёна долараў.

У цэлым складанасці на расійскім напрамку не сталі нейкай ужо занадта вялікай нечаканасцю. Зніжэнне попыту і павелічэнне канкурэнцыі выразна праглядаліся і дастаткова падрабязна аблічбоўваліся і расійскімі, і нашымі аналітыкамі. Калі кан'юнктура не самая спрыяльная — цэны на ключавыя экспартныя пазіцыі не растуць, а хутчэй маюць тэндэнцыю да зніжэння на фоне астуджэння попыту і павышэння канкурэнцыі, то рост эканомікі забяспечваецца за кошт інвестыцый. Укладанні ў асноўны капітал вызначаюць хуткасць трансфармацыі пад новыя ўмовы, выступаюць адной з умоў і індыкатараў павышэння канкурэнтаздольнасці. Цяпер лакаматывам, несумненна, становіцца інвестыцыйная праграма. За восем месяцаў укладанні ў асноўны капітал павялічыліся на 14,5 %. Прычым інвестыцыі ў машыны, абсталяванне і транспартныя сродкі выраслі на 20,2 %. Несумненна, укладанне ў абсталяванне яшчэ неабходна трансліраваць у павышэнне эфектыўнасці вытворчасці. Паказчык прадукцыйнасці працы і ў абсалютным, і ў адносным выяўленні пакуль пакідае надзеі на лепшае. За 8 месяцаў рост склаў усяго 1,2 %. Пры гэтым даходы насельніцтва і заработная плата ў рэальным выяўленні (з папраўкай на інфляцыю) павялічыліся недзе на 10 %. Пэўны дысбаланс прысутнічае. Хоць пераацэньваць яго ўплыў на макраэканамічную стабільнасць не варта. З аднаго боку, канешне, апераджальны рост прыбыткаў падціскае на інфляцыю: попыт некалькі апярэджвае выпуск. З іншага боку, дэфіцыт кадраў (факт усім вядомы) і падаражанне кошту працоўнай сілы ствараюць дадатковыя стымулы да павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў за кошт аптымізацыі бізнес-працэсаў, а таксама ўкладання ў інавацыі і тэхнічную мадэрнізацыю.

Будзем рэалістамі: найлепшая матывацыя інавацыйнага развіцця — пагроза крызісу. Калі ён не прадбачыцца, то ўсе аддаюць перавагу кансерватыўным мадэлям — зразумелым, апрабаваным, адносна стабільным і звыклым. Яны аптымальныя і для бізнесу (інавацыі — дадатковыя рызыкі), і для дзяржавы (мінімізуюць сацыяльныя рызыкі), і для радавых работнікаў (не патрабуюць дадатковых намаганняў па павышэнні кваліфікацыі, пераходу на новыя прынцыпы работы). Таму ў падаражанні працы ёсць і станоўчы фактар: яно штурхае і робіць амаль безумоўным выхад на новы ўзровень развіцця з пункту гледжання як тэхналогій, так і арганізацыі вытворчасці.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**

# СЦЕРАЖЫЦЕСЯ «ДАМАФОННЫХ» МАХЛЯРОЎ!

## Ашуканцы прыдумалі новы спосаб выманьвання грошай

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Аляксандр РЫНГЕВІЧ расказаў, як не стаць ахвярай «дамафонных» аферыстаў і захаваць свае зберажэнні.




«Апошнім часам пачасціліся выпадкі, калі тэлефонныя ашуканцы прадстаўляюцца супрацоўнікамі сэрвісных цэнтраў па замене дамафонных ключоў. Схема аналагічная той, дзе на першапачатковым этапе кіберзлачынцы пераконвалі ў неабходнасці замены лічыльнікаў уліку вады, газу або прадаўжэнні дагавора на паслугі сувязі», — адзначыў Аляксандр Рынгевіч.

Ён расказаў аб тым, што званкі могуць паступаць як на дамашні, так і на мабільныя тэлефоны. Пад выглядам работнікаў розных службаў, у тым ліку ЖКГ або сэрвісу па абслугоўванні дамафонаў, ашуканцы выманьваюць у грамадзяніна код з СМС, які паступіў ад любога інтэрнэт-сэрвісу. Як толькі чалавек называе лічбы з паведамлення, у гульню ўключаецца іншы аферыст, які прадстаўляецца супрацоўнікам міліцыі, Следчага камітэта, КДБ ці ДФР. Ён запалохвае грамадзяніна тым, што, расказаўшы код з СМС, ён прафінансаваў экстрэмісцкую ці іншую процізаконную дзейнасць і супраць яго ўжо ўзбуджана крымінальная справа.

«Далей сітуацыя можа развівацца па адным са сцэнарыяў, у якім псеўдасупрацоўнік прапануе «дапамогу» ў вырашэнні ўзніклай праблемы.Так, ілжэправаахоўнік можа пачаць запалохваць чалавека тым, што па яго месцы жыхарства будзе праведзены вобыск і неабходна «задэклараваць» наяўныя грошы і каштоўнасці, перадаўшы іх кур'еру або перавёўшы на «спецыяльны» рахунак. Ашуканцы могуць пачаць пераконваць грамадзяніна, што на яго імя нібы аформлены крэдыт, для анулявання якога трэба аформіць сустрэчны, а грошы перавесці на «часовы» рахунак у банку. Таксама аферысты могуць парэкамендаваць усталяваць мабільны дадатак і перадаць дадатковыя коды. Пры гэтым зламыснікі могуць атрымаць доступ да банкаўскага рахунку, лічбавых кодаў або пераканаць ахвяру прыкласці банкаўскую картку да яе тэлефона. Яшчэ ашуканцы могуць папрасіць сфатаграфаваць банкаўскую картку з двух бакоў, прадыктаваць яе нумар і код з адваротнага боку», — падкрэсліў намеснік начальнікац галоўнага ўпраўлення.

Праваахоўнік указаў на тое, што ва ўсіх варыянтах аферысты выкрадуць грошы. «Каб не стаць ахвярай кіберзлачынцаў, не трэба даваraць тым, хто тэлефануе, і ніколі нельга перадаваць лічбавыя коды каму б там ні было. Усю нечакана атрыманую ад незнаёмых асоб інфармацыю трэба пераправяраць, самастойна звярнуўшыся ў арганізацыю, ад імя якой ажыццёўлены званок», — рэзюмаваў Аляксандр Рынгевіч.

# СУПРАЦЬСТАЯЛА АШУКАНЦАМ — СТРАЦІЛА ГРОШЫ

## Жыхарку Шчучына падманулі пад выглядам «барацьбы з аферыстамі»

У Шчучынскі РАУС звярнулася 52-гадовая жыхарка райцэнтра і заявіла, што ёй патэлефанаваў невядомы і пад відам «барацьбы з ашуканцамі» завалодаў яе грашыма.

Як устанавілі праваахоўнікі, жанчыне паступіў званок у месенджар з невядомага нумара. Той, хто тэлефанаваў, паведаміў, што нібыта зламыснікі ад яе імя аформілі ўяўны крэдыт. А каб дапамагчы злавіць ашуканцаў, ёй неабходна ўзяць рэальны крэдыт і папоўніць пакаханы імі рахунак.

Грамадзянка паверыла незнаёмцу і аформіла пазыку, а потым пераявла ўсе грошы на паказаны ім рахунак. Увогуле яна адправіла больш за 11,6 тысячы рублёў. Па факце ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле «махлярства, учыненае ў буйным памеры».

Праваахоўнікі нагадваюць: супрацоўнікі банкаўскіх і іншых устаноў не тэлефануюць грамадзянам па працоўных пытаннях у месенджарах, не просяць аказаць садзейнічанне ў вышуку або злове зламыснікаў, прадоўжыць дагавор аб аказанні паслуг або ўзяць крэдыт. Калі вам паступіў падобны званок — неадкладна спыніце размову і паведаміце пра тое, што адбылося, у міліцыю.

# ДАПАМАГЛІ СУПРАЦОЎНІКІ БАНКА

## Пенсіянерку з Мінска работнікі банка пераканалі не пераводзіць грошы на «бяспечны рахунак»

У Партызанскае РУУС сталіцы звярнулася 77-гадовая жыхарка раёна, якую паспрабавалі падмануць тэлефонныя махляры. У месенджары жанчыне патэлефанаваў невядомы, які назваўся супрацоўнікам ДФР і паведаміў, што ад яе імя праводзяцца незаконныя фінансавыя аперацыі. Каб не стаць фігурантам крымінальнай справы, жанчыне настойліва рэкамендавалі задэкларававаць наяўныя грошы.



Пенсіянерка паверыла, пералічыла на сваю банкаўскую карту 16 тысяч рублёў, якія збіралася перавесці на «бяспечны рахунак». Для правядзення такой фінансавай аперацыі неабходна было зняць абмежаванні з банкаўскага рахунку на вывад сродкаў. Калі мінчанка паспрабавала гэта зрабіць, супрацоўнік банка папярэдзіла, што жанчыну спрабуюць падмануць аферысты. Усвядоміўшы, што ледзь не стала ахвярай махляроў, пенсіянерка звярнулася ў міліцыю.

Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа.

**Па матэрыялах БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит открытый повторный аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

**ЛОТ № 1**

Капитальное строение с инв. № 600/С-151680, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/4, район аг. Колодищи. Площадь: 20,6 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада.
Капитальное строение с инв. № 600/С-149363, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/1, район аг. Колодищи. Площадь: 696,7 кв. м. Наименование: Механизированный склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание механизированного склада. Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-182224, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/29, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 68,3 кв. м. Наименование: Помещение для мотопомпы (инв. № 29755). Назначение: Здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: 29А1/б-Помещение для мотопомпы (инв. № 29755). Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-159129, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/8, район аг. Колодищи. Площадь: 373,0 кв. м. Наименование: Склад АТ-10077 (инв. № 952702). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада АТ-10077 (инв. № 952702) А1/м. Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-159126, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/7, район аг. Колодищи. Площадь: 485,9. Наименование: Склад НПР-2552 (инв. № 48699). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада НПР-2552 (инв. № 48699) А1/м. Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-182220, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/28, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 265,2 кв. м. Наименование: Механизированный склад АТ-4086 (инв. № 14395). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 28А1/к-Механизированный склад АТ-4086 (инв. № 14395). Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-171273, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/9, район аг. Колодищи. Площадь: 2,8 кв. м. Наименование: Туалет на 2 очка № 1. Назначение: Здание специализированное коммунального хозяйства. Составные части и принадлежности: Одноэтажный кирпичный туалет на 2 очка № 1 (литер 1А1/к).
Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692, площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).
На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 364 436,36** | **Задаток, BYN** | **136 443,64** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 30 сентября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **01 октября 2025 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

ПРЫКМЕТЫ ЧАСУ

# КАХАННЕ ПА ПРАВІЛАХ

**Навошта заключаць шлюбны дагавор і ці значыць гэта, што чалавек не давярае сваёй палавінцы?**

Штогод у нашай краіне шлюбны дагавор афіцыйна афармляюць парадку 4-4,5 тысячы сямейных пар. Не надта шмат, улічваючы, што колькасць насельніцтва Беларусі — больш за 9 млн чалавек. І ўсё ж такая практыка існуе.

З аднаго боку, у нашай традыцыі каханне (асабліва такое, калі ён знайшоў матывацыю ўстаць на адно калена і працягнуць ёй кальцо, а яна — вымавіць «Згодна!») — гэта апрыёры пра безумоўны давер і «памерці ў адзін дзень», а не пра юрыдычныя нюансы. З іншага — узрост людзей, што ўступаюць у шлюб, па статыстыцы расце. А значыць, і за плячыма нявесты, і за плячыма жаніха ўжо ёсць жыццёвы вопыт. І шлюбны дагавор яны расцэньваюць не як «абразу недаверам», а як дарослы, разумны крок.

## НЕ ПАНАЦЭЯ АД СЯМЕЙНЫХ ПРАБЛЕМ

— Пад шлюбным дагаворам разумеецца пісьмовае пагадненне асоб, якія ўступаюць у шлюб або знаходзяцца ў шлюбе, што вызначае правы і абавязкі мужа і жонкі ў шлюбе і (або) пасля яго скасавання. Вы можаце заключыць шлюбны дагавор да ўступлення ў шлюб, а таксама ў любы час у перыяд шлюбу, — тлумачыць **адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ.**



***— Але ў нашым грамадстве стаўленне да шлюбнага дагавора, скажам так, неадназначнае. У чым прычына такой непапулярнасці?***

— Заключэнне шлюбнага дагавора, сапраўды, у Беларусі не настолькі папулярная, як на Захадзе. І ўсё ж ёсць нямала беларускіх пар, якія адказна ставяцца да маёмасных пытанняў і паступова прыходзяць да заключэння шлюбнага дагавора. На мой погляд, гэта звязана з павышэннем прававой культуры грамадзян, узроўню ўсведамленасці і інфармаванасці. У Беларусі заключэнне шлюбнага дагавора стала магчымым у 1999 годзе. І вось ужо шмат гадоў у грамадстве дыскутуюць адносна таго, ці варта яго заключаць.

***— Не сакрэт, што многія пары з прадузятасцю ставяцца да заключэння шлюбнага дагавора...***

— Праціўнікі дагавора выказваюць меркаванне, што дакумент можа быць расцэнены як праява няшчырасці пачуццяў партнёраў, прыкмета недаверу або нават меркантыльнасці. Ці магчыма рыхтавацца да разводу, яшчэ не ажаніўшыся?! Між тым па статыстыцы каля 50 % шлюбаў распадаюцца, прычым не толькі ў Беларусі. Будучыя муж і жонка не ўяўляюць усіх цяжкасцяў, якія могуць паўстаць пры разводзе і падзеле маёмасці.

***— Што вы можаце сказаць у абарону шлюбнага дагавора?***

— Гэты дакумент — не панацэя ад праблем у сямейным жыцці. Але ён можа стаць падмуркам для шчаслівага сямейнага жыцця і рацыянальным спосабам вырашэння сямейных пытанняў. Ніхто не можа прадбачыць лёс саюза, але пры наяўнасці шлюбнага дагавора муж і жонка могуць кантраляваць фінансавы аспект. Ён абараняе маёмасць больш заможнага ўдзельніка шлюбнага саюза; перашкаджае заключэнню шлюбу з чалавекам, які мае няшчырыя намеры; дазваляе пазбегнуць сваркі з-за сямейнага бюджэту; забяспечвае абарону бізнесу; дазваляе прадугледзець адказнасць па абавязацельствах; умацоўвае шлюб і сям'ю, інфармуючы сужэнцаў аб наступствах разводу; спрыяе ўсведамленню адказнасці адзін за аднаго і дзяцей і, у выпадку неабходнасці, спрашчае працэдуру разводнага працэсу.

## ДА ВЫКАНАННЯ — АБАВЯЗКОВЫ?

— Шлюбны дагавор дазваляе вызначыць лёс нажытай мужам і жонкай маёмасці і даўгоў, урэгуляваць узаемаадносіны з дзецьмі (формы, метады і сродкі выхавання, месца пражывання), памер і парадак выплаты аліментаў, прадугледзець абавязак па ўтрыманні адно аднаго пасля скасавання шлюбу і іншыя пытанні, якія не супярэчаць заканадаўству, — адзначае адвакат Алена Гронская. — З юрыдычнага пункту гледжання — гэта пагадненне мужа і жонкі або асоб, якія ўступаюць у шлюб, што вызначае маёмасныя і (або) асабістыя немаёмасныя правы і абавязкі мужа і жонкі ў перыяд шлюбу і (або) у выпадку яго скасавання.

***— Калі нашы суайчыннікі часцей за ўсё заключаюць шлюбны дагавор і што ў ім звычайна прапісваюць?***

— Шлюбны дагавор заключаецца не толькі да рэгістрацыі шлюбу. Вельмі часта — напярэдадні скасавання шлюбу: як інструмент мірнага ўрэгулявання пытанняў падзелу сумесна нажытай маёмасці. Радзей муж і жонка прыходзяць да неабходнасці заключыць шлюбны дагавор праз пэўны час пасля вяселля, калі ў сям'і ўсё добра. Ініцыятарамі яго заключэння часцей становяцца людзі, якія маюць вопыт шлюбаразводнага працэсу. І, як правіла, гэта людзі заможныя. Заключэнне шлюбнага дагавора магчыма толькі да дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб скасаванні шлюбу. Хвалюе сучасныя беларускія пары не толькі падзел загараднага дома, кватэры, дачы, аўтамабіля, але і адказнасць па абавязацель-

### ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ НЕАБХОДНЫЯ ДЛЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ ШЛЮБНАГА ДАГАВОРА?

**Для натарыяльнага пасведчання шлюбнага дагавора натарыусу неабходны:**

▶ дакумент, які сведчыць асобу (напрыклад, пашпарт);

▶ выпіска з рэгістрацыйнай кнігі — у выпадку, калі ў шлюбным дагаворы ўтрымліваюцца ўмовы адносна нерухомай маёмасці, сумесна нажытай вамі ці вашым мужам да заключэння шлюбнага дагавора. Такая выпіска можа быць атрымана натарыусам на папяровым носьбіце або ў форме электроннага дакумента;

▶ копія запісу акта аб заключэнні шлюбу, пасведчанне аб заключэнні шлюбу, даведка, якая змяшчае звесткі з запісу акта аб заключэнні шлюбу, адзнакі ў дакументах, што сведчаць асобу, якія (копіі, выпіскі з якіх) далучаюцца да асобніка шлюбнага дагавора, што захоўваецца ў натарыуса — у выпадку, калі вы знаходзіцеся ў шлюбе.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Щучинагропродукт»**

**Аукцион состоится 14.10.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32457 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание винзавода), общей площадью 3911,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, винзавод около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32458 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание проходной), общей площадью 158,5 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, проходная около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-72450 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), обшей площадью 4096,8 кв. м, расположенное по адресу Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А/2, сооружение благоустройства;<br>- линия электропередач кабельная (электроустановки РУ-0,4 кВ, КЛ-04 кВ, ВУ и внутреннее электрооборудование винзавода).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425886500012000029, площадью 0,2506 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений винзавода, расположенном по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, 39А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадь 1,3938 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0595 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0501 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 1,2713 га |
| **Начальная цена продажи** | 99 481,91 руб. (девяносто девять тысяч четыреста восемьдесят один рубль девяносто одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 9 948 руб. (девять тысяч девятьсот сорок восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 10.10.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.01.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |



**Информация о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Белорусское управление механизации»**

**Организатор аукциона – МГУКПП «Проектное специализированное бюро»,**
212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится 9 октября 2025 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**

**Предмет аукциона**
(наименование объекта, его местонахождение, площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1** – Капитальное строение (бетонное покрытие) с инв. № 700/С-121579, общей площадью 3900,3 кв. м, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Гаражный, 11/1; капитальное строение (забор железобетонный) с инв. № 700/С-121582, протяженностью 253,4 м, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Гаражный, 11/2.

**Начальная цена продажи составляет – 325 320 р. 00 к. (с учетом НДС).**

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 203, 206.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 6 октября 2025 года до 13.00.**

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах**
Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by,**
Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

УНП 700278209



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит электронные торги (оператор ЭТП – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638) по продаже **спецтехники, бывшей в употреблении**, принадлежащей **Червенскому лесхозу** (УНП 600004086):

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовой специальный сортиментовоз MAZ 6312B9-426-012 AP 5099-5 с гидроманипулятором**, 2017 г. в. | **108 960,00** |
| 2 | **Прицеп специальный сортиментовоз MAZ-837810-022 A 0869 E-5**, 2012 г. в. | **17 880,00** |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.10.2025 с 11.00 до 11.10. Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** | | |
| **Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | |



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, находящегося в собственности Минской области и принадлежащего **МИНСКОЙ ОБЛВЕТЛАБОРАТОРИИ** (Продавец) на праве оперативного управления

**Электронные торги состоятся 21.10.2025 в 11.00**

**Лот № 1:** CHEVROLET NIVA, кузов (рама) X9L212300B0337461.

Начальная цена без учета НДС – 7 100,00 руб. **Местонахождения:** г. Минск, ул. Казинца, 92/2.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов: ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ствах, валоданне бізнесам, правы на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, парадак атрымання даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці. У цэлым, у шлюбным дагаворы можна вызначыць даволі шырокі пералік пытанняў, але яго ўмовы не павінны супярэчыць асновам сямейнага заканадаўства, а таксама ставіць аднаго з сужэнцаў у вельмі неспрыяльнае становішча. Неабходна разумець, што абсалютна ўсе пажаданні ўключыць у яго не атрымаецца. Умовы шлюбнага дагавора не могуць абмяжоўваць праваздольнасць мужа і жонкі, у тым ліку права на судовую абарону. Па агульным правіле, у выпадку падзелу маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі, іх долі прызнаюцца роўнымі. Муж і жонка заключаюць шлюбны дагавор у тым выпадку, калі не хочуць дзяліць маёмасць (у выпадку разводу) у роўных долях. У дакуменце бакі могуць прадугледзець іншы парадак падзелу сумеснай маёмасці, а таксама тое, якая менавіта маёмасць будзе належаць кожнаму з іх. Шлюбны дагавор можа быць складзены як у дачыненні да ўсёй маёмасці мужа і жонкі, так і яго часткі. Муж і жонка таксама могуць заключыць яго ў дачыненні да будучай маёмасці і ўзгадніць яе прыналежнасць.

***— А змяніць шлюбны дагавор можна?***

— Бакі маюць права па ўзаемнай згодзе змяніць або скасаваць яго ў пісьмовым выглядзе з абавязковым натарыяльным пасведчаннем, але толькі да скасавання шлюбу. Яшчэ адно ўдакладненне: шлюбны дагавор не дае 100 % гарантыі, што кожны сужэнец атрымае менавіта тое, пра што дамовіліся на паперы. Суд можа прызнаць яго несапраўдным поўнасцю або часткова па прычыне неадпаведнасці заканадаўству, уяўнага або прытворнага характару шлюбнага дагавора, здзяйснення здзелкі пад уплывам памылкі, якая мае істотнае значэнне, альбо пад уплывам падману, гвалту, пагрозы. Існуюць падставы, пры наяўнасці якіх шлюбны дагавор не дзейнічае першапачаткова з моманту заключэння. Іншымі словамі, шлюбны дагавор вы выконваць не абавязаныя, ніхто не мае права прымусіць вас рабіць гэта, калі:

1) яго заключэнне забаронена заканадаўствам альбо яму не адпавядае (напрыклад, заключаны паміж былымі мужам і жонкай пасля разводу, асобамі, маладзейшымі за 14 гадоў, людзьмі, якія не ўступілі ў шлюб);

2) здзейснены толькі для выгляду, без намеру выконваць яго ўмовы або з мэтай прыкрыць іншую здзелку (напрыклад, муж і жонка не маюць намеру дзяліць маёмасць менавіта такім чынам, які прапісаны ў дагаворы, або мэтай з'яўляецца ўтойванне маёмасці, на якую звернута спагнанне крэдытора);

3) адзін з сужэнцаў недзеяздольны з-за псіхічнага расстройства (захворвання). Аднак калі шлюбны дагавор заключаны на выгадных для недзеяздольнай асобы ўмовах, па патрабаванні яго апекуна ён можа быць прызнаны судом сапраўдным;

4) шлюбны дагавор не завераны ў натарыуса;

5) не зарэгістраваны ў арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яго і здзелак з ім, калі ў вашым шлюбным дагаворы ўтрымліваюцца ўмовы адносна нерухомай маёмасці (напрыклад, купля, продаж, дарэнне дома, гаража і інш.).

## ЯК ЗАКЛЮЧЫЦЬ ШЛЮБНЫ ДАГАВОР

— Для шлюбнага дагавора ўстаноўлена абавязковая пісьмовая натарыяльная форма, — кажа адвакат Алена Гронская. — Яго складае натарыус на падставе дамоўленасцяў бакоў. Пры наяўнасці тонкасцяў і нюансаў праект шлюбнага дагавора складае адвакат (з абавязковым натарыяльным пасведчаннем).

Дагавор носіць асабісты характар, таму яго заключэнне не можа быць здзейснена праз прадстаўніка. Бакі падпісваюць 3 асобнікі шлюбнага дагавора — два выдаюцца бакам, адзін — застаецца ў натарыуса, распавядае адвакат.

— Калі шлюбны дагавор заключаюць муж і жонка, ён уступае ў сілу з моманту натарыяльнага пасведчання. Калі пара збіраецца ўступаць у шлюб, дагавор уступае ў сілу з дня рэгістрацыі шлюбу. Калі шлюбны дагавор змяшчае ўмовы аб нерухомай маёмасці, ён падлягае абавязковай рэгістрацыі ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Гэта важна памятаць, бо на практыцы бываюць выпадкі, калі пра гэта забываюць, — падкрэслівае суразмоўніца.

Дзеянне дагавора спыняецца з моманту скасавання шлюбу, дадае яна. Калі ў ім прадугледжаны абавязацельствы на перыяд пасля скасавання шлюбу, яны дзейнічаюць да поўнага выканання — напрыклад, утрыманне жонкі або дзяцей.

***— Алена, калі, на ваш погляд, заключэнне шлюбнага дагавора — абавязковае?***

— Напрыклад, у выпадку, калі адзін з сужэнцаў да заключэння шлюбу ўжо ўклаў грошы ў будаўніцтва жылля і выплачвае крэдыт. Фармальна кватэра можа стаць сумеснай уласнасцю мужа і жонкі, бо крэдыт выплачваецца з сумеснага бюджэту. Каб пазбегнуць праблем падчас падзелу нерухомасці і выплат па крэдыце, а таксама іншых непрыемных наступстваў, неабходна прапісаць загадзя ўсе ўмовы ў шлюбным дагаворы: напрыклад, што ў выпадку разводу ўласнікам жылля стане адзін з сужэнцаў, а другі атрымае ў якасці кампенсацыі грашовую суму ў пэўным памеры. Заключаць шлюбны дагавор або спадзявацца на лепшае — асабісты выбар кожнага. Задача адваката — растлумачыць наступствы прынятых рашэнняў з пункту гледжання заканадаўства і судовай практыкі, даць правовую ацэнку ўсіх абставін. На мой погляд, шлюбны дагавор — адзін з дзейсных спосабаў зберагчы сябе ад непрыемных наступстваў у выпадку разрыву адносін без значных фінансавых выдаткаў і напалу эмоцый. Кахайце, будзьце каханымі, але — не губляйце галаву!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**СУД МОЖА ПРЫЗНАЦЬ ШЛЮБНЫ ДАГАВОР НЕСАПРАЎДНЫМ, КАЛІ ЁН ЗАКЛЮЧАНЫ:**

▶ асобай, якая абмежавана судом у дзеяздольнасці;

▶ асобай, якая ў момант заключэння дагавора была не здольная разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі. Азначаная акалічнасць можа быць устаноўлена па выніках судова-псіхіятрычнай экспертызы, якую суд абавязаны прызначыць;

▶ непаўналетнім ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў (акрамя цалкам дзеяздольнага без згоды аднаго са сваіх законных прадстаўнікоў — бацькоў, усынавіцеляў або папячыцеляў);

▶ пад уплывам памылкі, падману, гвалту, пагрозы, зламыснага пагаднення аднаго боку з другім бокам, з-за збегу цяжкіх абставін на вельмі нявыгадных для сябе ўмовах, чым іншы бок скарыстаўся;

▶ у несапраўдным шлюбе. Напрыклад, калі адзін з сужэнцаў схаваў ад другога, што ўжо знаходзіцца ў шлюбе.


## ПЛЕЩЕНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 24 октября 2025 г. открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения в г.п. Плещеницы Логойского района Минской области

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Описание не завершенного строительством жилого дома | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена предмета аукциона (не завершенный строительством дом и цена земельного участка) бел. руб. | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения | | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. Высокая, 1, земельный участок с кадастровым номером 623255700001002203, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,0960 | Фундамент – сваи металлические. Степень готовности – 10 %. Износ – 20 % | Возможность подключения к электроэнергии, водоснабжению | 15 000,00 (2 672,15/ 12 173,12/ 154,73) | *публикация в газете + 148,00* | 1 500,00 |
| 2 | Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. Шутта, 14, земельный участок с кадастровым номером 623255700001002204, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом | 0,1000 | Фундамент – бутобетон и хозяйственная постройка. Степень готовности – 7 % и 100 % Износ – 60 % и 20 % | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению | 22 000,00 (9 393,47/ 12 451,80/ 154,73) | *публикация в газете + 189,00 руб.* | 2 200,00 |
| 3 | Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. Слободская, 21, земельный участок с кадастровым номером 623255700001002184, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,1000 | Фундамент – бутобетон. Степень готовности – 12 %. Износ – 20 % | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению | 17 000,00 (4 211,32/ 12 633,95/ 154,73) | *публикация в газете + 189,00, руб.* | 1 700,00 |
| 4. | Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. Солнечная, 12, земельный участок с кадастровым номером 623255700001002043, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,1000 | Фундамент – бутобетон. Степень готовности – 12 %. Износ – 60 % | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению | 16 000,00 (3 169,05/ 12 676,22/ 154,73) | *публикация в газете + 218,40, руб.* | 1 600,00 |
| 5. | Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. Шутта, 32, земельный участок с кадастровым номером 623255700001002200, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,1138 | Фундамент – бутобетон. Степень готовности – 12 %. Износ – 30 % | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению | 17 000,00 (3 011,03/ 13 716,92/ 272,05) | *публикация в газете + 189,00 руб.* | 1 700,00 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

*Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY51AKBB 3600 6191 5110 8000 0000 в ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, УНН 600537220, код платеж 04901. Фактический бенефициар – Плещеницкий сельский исполнительный комитет УНП 600181684.*

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предъявить документ удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельным участком, выставляемым на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 24 октября 2025 года в 11.00 по адресу: г.п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, д. 7, актовый зал.**

**Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00–13.00 с 14.00–17.00 по адресу: г.п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, д. 7.**

**Последний день приема заявлений 22 октября 2025 года до 17.00.**

**Контактные телефоны: (801774) 22165, 22335, +375291615739.**

**Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.**

# КАЛІ СЭРЦА ЗБІВАЕЦЦА З РЫТМУ



## За апошнія дзесяцігоддзі ў свеце адбыўся сапраўдны прарыў у лячэнні арытмій

Чым тлумачыцца рост гэтай хваробы? Якія метады яе лячэння лічацца зараз самымі эфектыўнымі? У чым складанасць працы арытмолагаў і чаму іх часам параўноўваюць з Шэрлакам Холмсам? Абмеркавалі гэта з урачом-кардыяхірургам, арытмолагам, рэнтгена-эндаваскулярным хірургам ангіяграфічнага кабінета ГКБ № 1 Мінска Дзімітрыем АНДРЭЙЧЫКАМ.



### АНАТОМІЯ ЗАХВОРВАННЯ

— Арытмія бывае рознай, — адразу ўносіць яснасць Дзімітрый Яўстаф'евіч. — Яна не заўсёды нясе пагрозу здароўю. Сэрца ў прынцыпе не павінна працаваць, як метраном. Пры нагрузцы, падчас стрэсу яно б'ецца часцей, у спакоі, на адпачынку — радзей. Для маладых людзей характэрна дыхальная арытмія — нармальная фізіялагічная асаблівасць, звязаная з працай вегетатыўнай нервовай сістэмы ў гэтым узросце. Але ўсё ж большасць арытмій — гэта паталогія з рознай ступенню пагрозы для жыцця. З-за некаторых можна памерці на працягу некалькіх хвілін, з іншымі жывуць дзесяцігоддзі.

***— Што адрознівае арытмію, якая прадстаўляе пагрозу здароўю?***

— Перш за ўсё нерэгулярны, няправільны рытм. Сэрца б'ецца нязвыкла, замірае, «трымціць». Па словах некаторых пацыентаў, «здаецца, быццам у грудзях нешта пераварочваецца». Часта гэты стан суправаджаецца трывогай, страхам. Чалавек адчувае: з ім нешта не тое. Усе арытміі дзеляцца на брадыярытміі, калі рытм сэрца становіцца занадта рэдкім, узнікаюць паўзы, і тахіарытміі, калі сэрца б'ецца значна часцей.

***— Якія фактары прыводзяць да арытміі? Што яе правакуе?***

— Ёсць прыклады прыроджаных анамалій. Сярод іх нярэдкі сіндром WPW (Вольфа-Паркінсона-Уайта). Арытміі могуць быць следствам перанесеных аперацый на сэрцы, захворванняў шчытападобнай залозы, хранічных запаленчых працэсаў, працяглай некампенсаванай артэрыяльнай гіпертэнзіі, сардэчнай недастатковасці і г. д. Неспрыяльна адбіваюцца на рытме сэрца курэнне, гарманальныя парушэнні, павышаны індэкс масы цела... Асноўныя «крыніцы» самай распаўсюджанай у свеце мігацельнай арытміі (фібрыляцыі перадсэрдзяў), на думку спецыялістаў, знаходзяцца ў левым перадсэрдзі, у вобласці вусцяў лёгачных вен.

### ПАДАРЫЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

***— Дзімітрый Яўстаф'евіч, якія метады лячэння лічацца сёння самымі эфектыўнымі?***

— За апошнія 10-15 гадоў у свеце адбыўся сапраўдны прарыў у гэтым кірунку. Раней кардыёлагі-тэрапеўты прызначалі прэпараты, якія зніжаюць актыўнасць сэрца, і збоі рытму станавіліся радзейшымі. Аднак прычыны паталогіі пры гэтым не зніклі. Акрамя таго, медыкаменты маюць шэраг пабочных дзеянняў, неспрыяльных для арганізма. Цяпер жа ўсё больш актыўна развіваюцца малаінвазіўныя хірургічныя метады лячэння арытмій. Без вялікіх разрэзаў, праз сасуды (часцей за ўсё сцегнавыя вены) мы заводзім спецыяльны інструментарый унутр сэрца. Самае навейшае абсталяванне дазваляе нам вывучыць сэрца знутры, максімальна дакладна вызначыць крыніцу арытміі, а затым спецыяльным радыёчастотным токам «прыпячы» яе. Такія ўмяшанні называюцца радыёчастотнымі аблацыямі (РЧА). На сёння гэта самы эфектыўны спосаб лячэння арытмій у свеце.

***— Але, акрамя РЧА, ёсць іншыя метады?***

— Так. Для кожнага пацыента можна выбраць аптымальны алгарытм дапамогі ў залежнасці ад асаблівасцяў паталогіі. Гэта можа быць крыяаблацыя, якая выкарыстоўвае нізкія тэмпературы для разбурэння паталагічных участкаў, а таксама лазерныя аперацыі, розныя тыпы прылад. Пры брадыярытміі, як правіла, імплантуюцца кардыёстымулятары. З дапамогай спецыяльных камп'ютараў-праграматараў мы задаём для кожнага пацыента свой рэжым стымуляцыі. Пры пагражаючых жыццю тахіарытміях, калі арганізм не можа справіцца з няправільным біццём сэрца, імплантуюць кардыявертары-дэфібрылятары, якія купіруюць прыступы. Людзям з выяўленай сардэчнай недастатковасцю усталёўваюць складаную прыладу з функцыяй рэсінхранізацыі. Тры электроды змяшчаюць у розныя ўчасткі сэрца і стымулююць так, каб яно скарачалася максімальна фізіялагічна, прымушаючы розныя камеры сэрца скарачацца сінхронна, як у здаровага чалавека. Такія прылады проста твораць цуды: сэрца пачынае працаваць больш эфектыўна, на 50—100 %.

***— У чым заключаецца самадапамога для людзей, якія пакутуюць на арытмію?***

— Ёсць арытміі, пры якіх заўсёды трэба мець з сабой «таблетку ў кішэні» на выпадак прыступаў. Таксама для іх купіравання рэкамендаваны спецыяльныя дыхальныя практыкаванні, так званыя «вагусныя пробы» (пробы Вальсальвы). Да самадапамогі я аднёс бы і барацьбу з лішняй вагой. Праведзеныя даследаванні паказалі: зніжэнне вагі значна паляпшае эфектыўнасць аперацый. У шматлікіх хірургічных цэнтрах могуць нават адмаўляць у аперацыі, пакуль пацыент не схуднее.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ, фота аўтара.**

***Поўны варыянт інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by***

ДА ВЕДАМА

# НА ЎЗРОЎНІ СЯРЭДНІХ ПАКАЗЧЫКАЎ

## Захваральнасць на ВРВІ не большая за мінулагоднюю

Як адзначыла намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Святлана НЯЧАЙ, захваральнасць на ВРВІ ў верасні трымаецца на ўзроўні сярэдніх паказчыкаў за апошнія два гады. У гэты час традыцыйна адзначаецца ўздым захворвання на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі. Прычын для гэтага дастаткова шмат, напрыклад фарміраванне новых калектываў у дзіцячых дашкольных установах, школах, вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Акрамя таго, беларусы вяртаюцца з водпускаў з блізкага і далёкага замежжа.

У структуры пераважаюць традыцыйныя негрыпозныя вірусы — рынавірусы, адэнавірусы, рэспіраторна-сінцытыяльны вірус, каранавірусы, уключаючы SARS-CoV-2, які стаў ужо сезонным, у тым ліку і «стратус», які актыўна займае сваю нішу ў Беларусі. Праўда, ён не выклікае цяжкага ходу захворвання.

Пры гэтым правядзення якіх-небудзь абмежавальных мерапрыемстваў, у тым ліку ў дзіцячых арганізаваных калектывах, не патрабуецца. У аптэчнай сетцы і ва ўстановах аховы здароўя ёсць усё неабходнае для аказання медыцынскай дапамогі як у амбулаторных, так і ў стацыянарных умовах.

Што датычыцца мер прафілактыкі, то, як адзначыла Святлана Нячай, яны ўсім добра вядомыя: праветрываць памяшканні, больш знаходзіцца на свежым паветры, апранацца ў адпаведнасці з надвор'ем, ужываць садавіну і агародніну, якіх цяпер дастаткова. А вось вакцынацыю ад грыпу рэкамендуецца запланаваць на кастрычнік-лістапад — гэта эфектыўная мера пры падрыхтоўцы да сезона з больш высокім узроўнем захваральнасці.

**Алена КРАВЕЦ.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2433 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-14073 (назначение – Здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – Швейный цех, общая площадь – 1945,1 м.кв, составные части и принадлежности – Подвал, уборная, ограждение, четверо ворот, три калитки, два покрытия); Вентилятор, инв. № 399; Вентилятор, инв. № 322; Вентилятор ВЦ-5, инв. № 388; Вентилятор центробежный, инв. № 389; ГЕРАН ЛЮКС ПГУ-1-100, инв. № 949; ГЕРАН ПГУ-1-300, инв. № 950; ГЕРАН ПГУ-С-153, инв. № 951, Кран-балка, инв. № 329; Лебедка првод-электр. С508, инв. № 403; Машина швейная Minerva мод. 428-2 № 3407 + приспособление для светоотр. ленты 25 мм, инв. № 910; Механическая щетка, инв. № 575; Нож швейный, инв. № 448; Парогенератор Gold Eagle DL-7, инв. № 952; Печь СВЧ «Горизонт» 20MW800-1378, инв. № 2343; Печь СВЧ Горизонт 20MW800-1378, инв. № 2345; Плита газовая, инв. № 622; Плотер JETLINK -180 N, инв. № 923; Принтер HP, инв. № 686; СТЕГАЛЬНАЯ МАШИНА Machine tech 1-61 m, инв. № 827; Стол Gold Eagle DL-1068, инв. № 653; Тележка ТС, инв. № 429438; Факс, инв. № 3200; Швейная машина 876, инв. № 558; Швейная машина 852, инв. № 235; Швейная машина 852, инв. № 319; Швейная машина 852, инв. № 247; Швейная машина 852, инв. № 321; Швейная машина 852, инв. № 574; Швейная машина 852*5, инв. № 46; Швейная машина 852*5, инв. № 288; Швейная машина 852*5, инв. № 311; Швейная машина пуговичная, инв. № 599; Шкаф холодильный, инв. № 633; Электроплита, инв. № 634 | 319366,80 | 31936,68 | 15968,34 |

| | |
|---|---|
| В отношении лота проводятся первые торги | |
| Местонахождение: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, 1/2 | |
| Лот № 2433 расположен на земельном участке с кадастровым номером 241200000001000283, площадь – 0,9829 га, назначение – Земельный участок под производственную базу. Земельный участок является неделимым, предоставлен на праве аренды. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на природных территориях подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь – 0,9829 га. На часть земельного участка имеется сервитут | |
| **Дата и время проведения торгов** | **23 октября 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 22 сентября 2025 года до 16.00 21 октября 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту 2433, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых 23.10.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 4 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать (заключить) с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ирина Сигизмундовна, +375298903354.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: 8 (017) 255-29-28, 8 (029) 576 77 15; e-mail: kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., г. Лепель, ул. Володраского, д. 1, УНП 30038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ПАМЯЦЬ

# НА МАЛУЮ РАДЗІМУ, ДА СВАІХ КРЫЖОЎ



**На Павалішынскіх могілках пад шатамі векавых дрэў маўкліва стаяць некалькі замшэлых, пахіленых, каменных крыжоў. Ніхто не скажа, на чыіх магілах: можна хіба меркаваць, што непадалёк было нейкае паселішча. Павалішынам яно стала ў канцы васямнаццатага стагоддзя...**

Іларыёну Афанасьевічу Павалішына «за пахвальную службу і за адважныя і выдатныя яго подзвігі ў бітвах» сама імператрыца Кацярына II падаравала шпагу з брыльянтамі і 600 душ сялян у Полацкім павеце.

У 1797 годзе віцэ-адмірал Павалішын быў па хваробе звольнены ў адстаўку і з жонкай Аўдоццяй Фёдараўнай накіраваўся ў падараваны маёнтак Прыхабы. Не так далёка ад яго, у нейкіх дзесяці кіламетрах, ён заснаваў сядзібу Ларыёны, якая пазней стала вёскай Павалішына. Для яе жыхароў, для дзяцей віцэ-адмірал на ўласныя сродкі пабудаваў школу, бальніцу і царкву ў гонар Праабражэння Гасподняга.

Выбар месца для яе — непаводдаль ад тых самых старажытных крыжоў — быў, відавочна, зусім невыпадковы: у любым адэкватным грамадстве захоўваецца нябачная сувязь з продкамі...

Пазней, на вялікі жаль, царква была разбурана; у пошуках шпагі з брыльянтамі вандалы разрабавалі фамільны склеп Павалішыных... Засталося ўражанне, што аб жыцці сям'і могуць нагадаць хіба два магутныя дубы, пасаджаныя бацькам у гонар сыноў.

Аднак па ініцыятыве полацкіх энтузіястаў на месцы былой царквы пачаліся раскопкі. Са складзеных асколкаў надмагільнай пліты ўдалося даведацца, што памёр віцэ-адмірал 4 красавіка 1799 года. Пахаваны на трэці дзень...

У хуткім часе пасля гэтага ў нашай вёсцы Янкавічы і гарадскім пасёлку Расоны адбылося ўрачыстае адкрыццё памятных знакаў у гонар Іларыёна Павалішына. Прах знакамітага віцэ-адмірала, які пачынаў з мічманаў, быў яшчэ раз адпеты святаром і знайшоў супакой на гістарычных могілках. Пазней на магіле з'явіўся гранітны помнік. Агароджа вакол яго акрэслівае месца былой царквы.

Маракі і вяскоўцы аддаюць даніну павагі знакамітаму флатаводцу. Нядаўна падчас аўтапрабегу па маршруце Віцебск — Мёры — Расоны — Янкавічы — Віцебск да месцаў ушанавання памяці віцэ-адмірала ўскладзены кветкі.

Што датычыцца старажытных крыжоў, то яны, як мяркуецца, «прыйшлі» сюды пасля прыняцця хрысціянства. Да таго часу памерлых спальвалі і насыпалі курганныя могільнікі. Аб гэтым сведчаць раскопкі, якія ў сямідзясятых гадах мінулага стагоддзя праводзіліся ў нашых мясцінах пад кіраўніцтвам знакамітага археолага Георгія Васільевіча Штыхава.

Годам заснавання вёскі Павалішына можна лічыць 1798-ы. А вось само пасяленне продкаў было, магчыма, з дванаццатага-трынаццатага стагоддзя, а то і раней. Дакладны час мы, на жаль, не ведаем. Як не ведаем і таго, чаму наша вёска, Янкавічы, стала называцца менавіта так.

Тым не менш гісторыя месца была цікавай і багатай. Сюды, на радзіму, да крыжоў, каб пакланіцца родным і блізкім людзям, каб не забыцца пра свае карані, прыходзяць нашчадкі.

**Аляксандр Матошка,** *Расонскі раён.*

ЧАЛАВЕК — ЧАЛАВЕКУ

# «...ШЧЫРЫМ ПРЫВІТАННЕМ З МІНУЛАГА»

**Прыгожае слова — «сядзіба». Амаль пры кожнай з іх — гаспадарчыя пабудовы, агароды, сады, без якіх ну зусім не ўяўляюцца беларускія вёскі!**

Наш сад — з традыцыйнымі антонаўкай, белым налівам, цыганкай, грушамі-цукроўкамі — садзіў яшчэ мой дзядуля ў сярэдзіне трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. Штрыфель, ранеты, малінаўку, слівы ды чарэшні з'явіліся клопатам таты.

Мы, яго дзеці, у садзе і разам з садам раслі, а ўжо як любілі... Найвялікшым шчасцем было прыставіць да дрэва высокую лесвіцу, залезці на яблыню амаль да самага верху, побач прычапіць кошык...

На жаль, ён вельмі хутка запаўняўся спелымі вялікімі яблыкамі, якія потым асцярожна, па адным складаліся ў спецыяльныя скрынкі. А ты — зноўку лез на дрэва. Глянеш уніз, на зямлю — там яшчэ зялёная восеньская прыгажосць, глянеш уверх — там бязмежнае блакітнае неба з лёгкімі белымі аблокамі і сонца, сонца, сонца! Напрацуешся за дзень, натомішся, вечарам заплюшчыш вочы — перад імі ўсё той жа малюнак.

З узростам даглядаць сады ўсё цяжэй і цяжэй. Старэюць і сыходзяць у лепшы свет іх гаспадары, хварэюць і выміраюць дрэвы. Вось і ў нашым садзе, некалі вялікім, іх цяпер менш за палову. Летась бура шмат паламала, сёлета пашалелі вятры — яблыкаў мала, але ж яны ў нас свае — ад бацечкі, ад дзядулі, шчырым прывітаннем з мінулага.

**Т. Новік,** *г. Клецк.*



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## по объекту строительства
### «Застройка микрорайона «Лошица-9» (2-я очередь). Жилой дом № 14 по генплану»

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник–четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 26 по ул. Сергея Есенина, фактический срок строительства – 12 месяцев.
2. Жилой дом № 28 по ул. Сергея Есенина, фактический срок строительства – 12 месяцев.
3. Жилой дом № 6 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
4. Жилой дом № 7 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
5. Жилой дом № 8 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
6. Жилой дом № 9 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
7. Жилой дом № 10 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
8. Жилой дом № 11 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
9. Жилой дом № 12 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
10. Жилой дом № 1 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.
11. Жилой дом № 3 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.
12. Жилой дом № 5 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства**

Цель строительства – строительство многоквартирного жилого дома № 14 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 2-я очередь строительства.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 1-й квартал 2026 года.

Строительство объекта осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 2620 от 16.08.2018 собственными силами без заключения договоров подряда.

Положительные заключения государственной экспертизы № 334-15/20 от 10.07.2020, № 292-15/23 от 19.06.2023.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 2620 от 16.08.2018, № 903 от 29.03.2019, № 4841 от 30.11.2023, свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельных участков от 16.11.2023 № 500/2036-1554 (площадью 3,6811 га) и от 02.10.2019 № 500/988-359 (площадью 0,1122 га).

**Характеристика объекта**

Объект – 274-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом, состоит из семи секций, серии М464М-10 со встроенным нежилым помещением на первом этаже, с техническим подпольем и «теплым» чердаком. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения подготовительных работ под отделку стен, полов и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели, блоки из ячеистого бетона, газосиликатные блоки. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Строительство осуществляется согласно Кодексу Республики Беларусь об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности и др. действующему законодательству. Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 79 квартир, из них 19 однокомнатных квартир общей площадью 48,95 м², 1 двухкомнатная квартира общей площадью 69,26 м², 20 трехкомнатных квартир общей площадью 91,94 м², 18 трехкомнатных квартир общей площадью 92,58 м², 20 трехкомнатных квартиры общей площадью 98,06 м², 1 четырехкомнатная квартира общей площадью 120,58 м².

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

| Количество комнат | Площадь объекта долевого строительства (квартиры), м² | Количество квартир, ед. | Стоимость 1 м² при 100 % оплате, бел. руб. | Стоимость 1 м² при условии кредитования в рамках партнерской программы*, бел. руб. | Стоимость 1 м² при рассрочке платежей, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 48,95 | 19 | 4 650 | 4 725 | 4 900 |
| 2 | 69,26 | 1 | 4 550 | 4 725 | 4 900 |
| 3 | 91,94 | 20 | 3 850 | 4 025 | 4 200 |
| 3 | 92,58 | 18 | 3 850 | 4 025 | 4 200 |
| 3 | 98,06 | 20 | 3 850 | 4 025 | 4 200 |
| 4 | 120,58 | 1 | 3 675 | 3 780 | 3 885 |

**Банком-партнером является ОАО «Белинвестбанк».*

**Условия оплаты**

При условии единовременной оплаты объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

При кредитовании в рамках партнерской кредитной программы по объекту долевого строительства расчет производится единовременно в полном объеме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

При условии оплаты объекта долевого строительства согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир**

Прием заявлений осуществляется отделом реализации недвижимости ОАО «МАПИД» (г. Минск, пр-т Жукова, 6, кабинет № 1), понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30, кроме выходных и праздничных дней.

Телефоны для справки: 209-87-32, 209-87-52.

Заявления для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 9.00 29.09.2025 до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина или его представителя, наличие паспорта или доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

КІНАКРОКІ

# КАЛІ ЖЫВЕШ ПРАФЕСІЯЙ...

## У Мінску прадставілі фільм пра настаўнікаў

Прэм'ерны паказ фільма «Класная» прайшоў у Мінску ў кінатэатры «Масква». Чырвоная дарожка, сумесныя фатаграфіі, аўтографы, музыка і, вядома ж, прагляд самой кінастужкі... Атмасфера неверагодная. Мерапрыемства сабрала ўсіх, хто ўдзельнічаў у стварэнні кінакарціны: ад рэжысёра і акцёраў да членаў здымачнай групы.




Браў удзел у стварэнні «Класнай» на ўсіх этапах і міністр культуры, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі.

— У нас атрымаўся выдатны добры фільм пра нашых настаўнікаў. Дзякуй Міністэрству адукацыі за кансультацыі. Каму, як не ім, ведаць пра першыя крокі настаўнікаў у прафесіі? Гэта сапраўды была вельмі добрая дапамога і падтрымка, — падзяліўся ён.

Таксама Руслан Чарнецкі адзначыў, што рэжысёр кінакарціны Кірыл Халецкі праявіў сябе ў працэсе здымак вельмі прафесійна.

— Гэта была вельмі дакладная праца з усёй здымачнай групай. Няўзброеным вокам відаць, як ён расце ў прафесійным плане. Мне вельмі падабаецца тое, што ён не стаіць на месцы і ўвесь час развіваецца. Гэта вялікі плюс, — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу сам Кірыл Халецкі падзяліўся, што прэм'ерны дзень для яго вельмі асаблівы.

— У нас неяк так павялося, што рэжысёр са сваім фільмам праходзіць усе стадыі вытворчасці. І таму апошні год майго жыцця — гэта суцэльная «Класная». Сёння асаблівыя нейкія пачуцці я адчуваю, калі ўсе гэтыя людзі стаяць на сцэне. Звычайна здымачная група застаецца ў цені, але сёння яны разам з акцёрамі перад вамі, і яны ўсе проста зззяюць, — адзначыў ён.

Па словах рэжысёра, насамрэч галоўныя героі фільма «Класная» — педагогі.

— Яны здзяйсняюць сапраўды вялікі подзвіг, і наш фільм вельмі трапятліва, прыгожа, элегантна і шчыра пра гэта вам раскажа, — заключыў ён.

Прэм'ера фільма скончылася гучнымі авацыямі і мноствам цёплых слоў і пажаданняў. Цяпер ацэньваць кінастужку будуць гледачы ў кінапракаце па ўсёй краіне.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

# Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК 761 мм рт.сл. | +14..+15°С | +19..+21°С |
| ВІЦЕБСК 759 мм рт.сл. | +14..+15°С | +21..+23°С |
| МАГІЛЁЎ 761 мм рт.сл. | +13..+14°С | +22..+25°С |
| ГОМЕЛЬ 768 мм рт.сл. | +11..+14°С | +19..+20°С |
| ГРОДНА 760 мм рт.сл. | +17..+18°С | +24..+25°С |
| БРЭСТ 762 мм рт.сл. | +16..+18°С | +26..+28°С |

Паводле даных Белгідрамета

## ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| МАСКВА | +20..+22°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +15..+18°С |

## Месяц

*Апошняя чвэрць 14.09.–20.09. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Варта больш старанна аберагаць канфідэнцыяльныя звесткі. Сітуацыя цяпер такая, што адно неасцярожнае слова — і ваш сакрэт будзе раскрыты. Але добра, што гэта адзіная з магчымых непрыемнасцяў. Напярэдадні чакае немалая колькасць спраў, у якіх вы зможаце прымяніць і прыродныя таленты, і кемлівасць, і інтуіцыю.

**ЦЯЛЕЦ.** Інтэлектуальны складнік будзе на вышыні. Шукайце максімальна правільнае і карыснае выкарыстанне энергіі. Магчыма, варта накіраваць яе на стварэнне вакол сябе гармоніі. Пазбягайце ўтапічных ідэй.

**БЛІЗНЯТЫ.** Уласныя дэманы на гэтым тыдні могуць прымусіць забыцца пра спакой. Гэта падстава для таго, каб неадкладна разабрацца ў сабе і ліквідаваць кожную з крыніц раздражнення. Выдатны настрой адновіцца, як толькі пачняце больш часу ўдзяляць дробязям. Да канца тыдня з'явіцца ўпэўненасць у тым, што асабістае жыццё канчаткова ўвайшло ў нармальнае рэчышча.

**РАК.** Абстаноўка гэтым тыднем не вельмі спрыяльная. Верагодна, прыйдзецца захоўваць чыйсьці сакрэт або стрымліваць раздражненне, якое будзе пераліваецца праз край. Усё больш-менш нармалізуецца прыкладна да серады.

**ЛЕЎ.** Вы станеце галоўнымі рэжысёрамі падзей наступнага тыдня. Зоркі не раяць забываць пра інтарэсы процілеглых бакоў. У які бок павее дзьме вецер — у той ён і паплыве. Аднак усё ж такі важна сачыць за напрамкам ветру, то-бок аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю. Менш сумневаў у асабістых справах.

**ДЗЕВА.** Вам варта любымі шляхамі пазбягаць дэбатаў. Няхай навакольныя застануцца пры сваім меркаванні. Галоўнае — захаваць эмацыянальную раўнавагу і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Сярэдзіна тыдня парадуе тых, хто, як здавалася, безнадзейна закаханы. Вы атрымаеце магчымасць збліжэння з пасіяй, але гэта адбудзецца не раптоўна. Выхадныя гараскоп рэкамендуе прысвяціць толькі сабе.

**ШАЛІ.** Гараскоп не прадвяшчае якіх-небудзь цяжкасцяў. Абстаноўка вакол вашага знака будзе прэснай і не спрабуйце яе разгайдаць, вам гэта не трэба. Падумайце пра справы, якія пастаянна адкладвалі, і прыступайце да іх рэалізацыі.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень для вас будзе спрыяльным. Цяпер выдатны момант, каб задаць важнае пытанне, выкласці камусьці свае пажаданні ці сфармуляваць просьбу. Устрымайцеся ад спраў, зыход якіх для вас няясны.

**СТРАЛЕЦ.** Вас чакае прырост жыццёвых сіл. Магчыма, вы даведаецеся інфармацыю, якую можна будзе выкарыстоўваць з разлікам на будучыню. Перспектыўныя дамоўленасці, заключаныя ў гэты перыяд, будуць на руку не толькі вам, але і другому боку, што гарантуе паразуменне і выдатны настрой.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень будзе даволі насычаным. Вам прыйдзецца прымаць рашэнні, ад якіх залежыць найбліжэйшая будучыня. У чарадзе падзей лёгка забыцца пра сябе, але зоркі ўсё ж перасцерагаюць вас ад падобнага. Знайдзіце час, каб праверыць свой арганізм на наяўнасць непрыемных сімптомаў і ўдзяліце ўвагу адпачынку.

**ВАДАЛІЎ.** Для вас будуць прыярытэтнымі клопаты сям'і. Пры бліжэйшым разглядзе стане зразумела, што існуе шмат спраў, якія раней вы чамусьці не заўважалі. Хутчэй за ўсё дыстанцыйна, але ўсё ж давядзецца ўдзельнічаць у жыцці іншых людзей. Жаданне даказаць сваю значнасць не пакіне вас ад працягу ўсяго тыдня.

**РЫБА.** У многіх паўстане неабходнасць завяршыць справы, раней адкладзеныя да лепшых часоў. Вашы энергетычныя рэсурсы будуць дастаткова высокія, таму няма сэнсу іх не выкарыстоўваць. Правесці найбліжэйшыя дні з максімальнай карысцю — значыць арганізаваць асабістую прастору, упарадкаваць свае думкі, умацаваць адносіны з блізкімі.

## 20 ВЕРАСНЯ — Даты | Падзеі | Людзі

**У краіне**

**1910** год — нарадзіўся Аляксей Васільевіч Лыкаў (г. Кастрама, Расія), вучоны ў галіне цепла- і масапераносу, акадэмік НАН Беларусі (1956), акадэмік Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры (1957—1964), доктар тэхнічных навук (1940), прафесар (1941), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1957). У 1956—1974 гг. дырэктар Інстытута цепла- і масаабмену АН Беларусі, адначасова ў 1968−1974 гг. прафесар, загадчык кафедры БДУ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), прэміі імя І. І. Паўзунова АН СССР (1970). Аўтар больш за 230 навуковых прац, у тым ліку 18 манаграфій, 12 вынаходстваў. Імем Лыкава названы Інстытут цепла- і масаабмену НАН Беларусі.

**1945** год — у Мінску адкрыты Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, які першапачаткова размяшчаўся ў некалькіх пакоях Палаца культуры прафсаюзаў. Стваральнікам і першым дырэктарам была жонка паэта В. Луцэвіч. Сучасны будынак музея ўзведзены ў 1959 годзе на месцы невялікай драўлянай хаткі, у якой Янка Купала жыў да вайны. У музеі захоўваюцца прадметы духоўнай і матэрыяльнай культуры, звязаныя з жыццём і грамадскай дзейнасцю народнага паэта.

**У свеце**

**1519** год — мараплавец Фернан Магелан адбыў з порта Санлукар-дэ-Барамеда (Іспанія) на чале флатыліі з пяці судоў («Трынідад», «Сан-Антоніа», «Сант'яга», «Кансепсіён» і «Вікторыя»). Ён, як і Калумб, быў прыхільнікам ідэі, што Зямля круглая і падарожжа на захад прывядзе на ўсход.

**1802** год — у Расіі на падставе Маніфеста Аляксандра І «Аб заснаванні міністэрстваў» замест калегій былі ўтвораны 8 міністэрстваў: ваенна-сухапутных сіл, ваенна-марскіх сіл, замежных спраў, юстыцыі, камерцыі, народнай асветы, фінансаў і унутраных спраў. Кожнае міністэрства атрымала «Наказ», палажэнне, у якім вызначаліся яго задачы. Найбольшым і шматпрофільным стала Міністэрства ўнутраных спраў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 11 433. Індэкс 63850. Зак. № 1967. Нумар падпісаны ў 19.30 19 верасня 2025 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12